УДК [304.4 + 316.42] (476)

**Н. Я. Захарава**
Інстытут філасофіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі

# САЦЫЯЛЬНЫ КАПІТАЛ ЯК ФАКТАР ЭКАЛАГІЧНАЙ АДКАЗНАСЦІ ГРАМАДСТВА

Артыкул вызначае метадалагічныя падыходы да аналізу паняцця «сацыяльны капітал», яго вымярэння і квантыфікацыі ў кантэксце распрацоўкі прынцыпаў і ажыццяўлення крытэрыяў аптымальнага (узаемаўзгодненага) сацыяпрыроднага развіцця грамадства і чалавека. Даказваецца, што змена прыярытэтаў эканомікі ў бок бестурботнай жыццядзейнасці чалавека вызначае ў аснове сацыяльнай палітыкі прынцыпы экацэнтрызму. Разглядаецца праблема палярызацыі грамадства ва ўмовах глабальных экалагічных рызык на фоне фінансавых, эканамічных, палітычных нявызначанасцяў. Задача захавання і паляпшэння сацыяльных умоў жыцця большасці насельніцтва (даступнасці адукацыі, аховы здароўя, сацыяльнага забеспячэння належнай якасці жыцця) павінна вырашацца з улікам адноснасці, рэлятыўнасці ўсіх сацыяльных установаў сучаснасці, і транзітыўнага характару сацыяльна-палітычных і эканамічных працэсаў у грамадстве. Таксама важна ўлічваць праблемны, адкрыты для дыскусій характар самога разумення ўстойлівага прагрэсіўнага развіцця грамадства як дасягнення неабходнай якасці жыцця. Паказваецца, што паколькі сацыяльная палітыка дзяржавы ёсць макрасацыяльная дзейнасць, якая ахоплівае ўсю ці значную частку грамадства, яна часцей за ўсё выходзіць за межы асабаснага кола жыцця і прыватнай цікавасці і маштабуецца. Экалагічная адказнасць грамадства і дзяржавы, кожнага грамадзяніна, якая адпавядае мадэлі ўстойлівага развіцця і высокаму ўзроўню экалагічнай культуры, праяўляецца ў неабходнасці захоўваць і аднаўляць прыроднае асяроддзе, падтрымліваць сваё здароўе, адказваць за «экалагічнасць» сваіх дзеянняў, успрымаючы іх не толькі як асабістую экзістэнцыйную праблему, але і як сацыяльна значную каштоўнасць. Сацыяльны капітал у беларускім грамадстве пры належным узроўні сацыяльнага даверу можа пазіцыянавацца як фактар узрастання экалагічнай адказнасці і экалагізацыі палітыкі ў цэлым.

**Ключавыя словы**: грамадства, сацыяльны капітал, экалагічная культура, экалагтічная адказнасць, сацыяльны давер, устойлівае развіццё.

**Для цытавання**: Захарава Н. Я. Сацыяльны капітал як фактар экалагічнай адказнасці грамадства // Труды БГТУ. Сер. 6, История, философия. 2024. № 1 (281). С. 126–130.
DOI: 10.52065/2520-6885-2024-281-24.

**N. E. Zakharava**
Institute of Philosophy of the National Academy of Sciences of Belarus

# SOCIAL CAPITAL AS A FACTOR ENVIRONMENTAL RESPONSIBILITY OF THE SOCIETY

The article defines methodological approaches to the analysis of the concept of «social capital», its measurement and quantification in the context of the development of principles and implementation of criteria for optimal (mutually agreed upon) socio-natural development of society and man. It is proved that changing the priorities of the economy towards safe human life puts the principles of ecocentrism at the basis of social policy. The problem of polarization of society is considered in the context of global environmental risks against the background of financial, political, and economic uncertainties. The task of preserving and improving the social conditions of life of the majority of the population (availability of education, health care, social protection) must be solved taking into account the relativity, relatability of all social dreams of our time, taking into account the transitive nature of socio-political and economic processes in society. It is also important to take into account the problematic, open-for-discussion nature of the very understanding of sustainable progressive development of society as achieving the necessary quality of life. It is shown that since the social policy of the state is macro-social and covers the entire or significant part of society, it most often goes beyond the boundaries of the personal circle of life and is scaled up. The environmental responsibility of society and the state, of every citizen, which corresponds to the model of sustainable development and a high level of environmental culture, is manifested in the need to preserve and restore the natural environment, maintain one's health, be responsible for the "environmental friendliness" of one's actions, perceiving them not only as a personal existential problem, but also as a socially significant value. Social capital in Belarusian society, with the proper level of social trust, can be positioned as a factor in increasing environmental responsibility and greening policy in general.

**Keywords**: society, social capital, environmental culture, environmental responsibility, social trust, sustainable development.

**For citation**: Zakharava N. E. Social capital as a factor environmental responsibility of the society. *Proceedings of BSTU, issue 6, History, Philosophy*, 2023, no. 1 (281), pp. 126–130 (In Belarusian).
DOI: 10.52065/2520-6885-2024-281-24.

**Уводзіны**. Працэсы трансфармацыі, якія адбываюцца ў беларускім грамадстве, з'яўляюцца прычынай і адначасова вынікам кардынальнай змены парадыгмальных асноў грамадскага развіцця, змены сістэмы каштоўнасцяў, мадэрнізацыі ранейшай структуры грамадскіх інстытутаў, якія служаць базісам сацыятальнага ўзнаўлення. Фарміруецца новая як сацыяльная, так і сацыяпрыродная рэальнасць, і яе ўстойлівасць залежыць ад пэўнага якаснага стану грамадства, да якога можна аднесці грамадскую салідарнасць, экалагічную адказнасць, давер у грамадстве і ўзрастаючы на іх аснове сацыяльны капітал. Пытанні салідарнасці і ўзаемадапамогі закранালі ў сваіх працах Дж. Лок, І. Кант, Т. Гобс, Сен-Сімон, Д. Юм і Р. Оўэн. М. Вэбер убачыў узаемасувязь паміж сацыяльным прагрэсам і ментальнымі характарыстыкамі народа. У сацыялагічнай тэорыі Э. Дзюркгейма праблема даверу апісвалася ў кантэксце грамадскіх сувязяў. Даследаванні ў рамках канструявання сацыяльнай структуры закранালі пытанні даверу як сацыяльнага капіталу грамадства ў працах Т. Парсанса, П. Штомпкі, Ф. Фукуямы, Р. Дарэндорфа. Гэта ажыццёўлена і ў інстытуцыянальным кантэксце, і ў сувязі са змяненнем практык штодзённасці. Станаўленне паняцця «сацыяльны капітал» звязваецца перш за ўсё з імёнамі П. Бурдзье, Дж. Коўлмана, Р. Патнэма. Менавіта П. Бурдзье, даследуючы дынаміку сацыяльнага капіталу, указаў на яго здольнасць да канвертавання ў іншыя віды, перш за ўсё ў эканамічны капітал [1]. Паняцце сацыяльнага капіталу тлумачыцца ў замежнай і айчыннай літаратуры з розных пунктаў гледжання і сацыялагічных школ.

**Асноўная частка**. Пошукі дэфініцыі і вымярэння сацыяльнага капіталу цалкам неабходныя, асабліва з прычыны дэмакратызацыі большасці грамадскіх працэсаў, калі, на думку І. Валерстайна, фактычна адбываецца ўзаконьванне дэмакратычнага ціску як найважнейшага элемента палітычнай стабілізацыі. «Цяпер гэтая тэндэнцыя развілася настолькі, – піша Валерстайн, – што народныя патрабаванні сталі абыходзіцца вельмі дорага. На задавальненне сучасных сацыяльных чаканняў вялікай часткі чалавецтва, якія датычацца падтрымання на адэкватным узроўні сістэм аховы здароўя і адукацыі, цяпер ідзе значная доля ствараемай у сусветным маштабе прыбавачнай вартасці. Фактычна такія выдаткі з'яўляюцца формай сацыяльнай заработнай платы, якая вяртае класам, якія ўдзельнічаюць у вытворчасці, значную частку прыбавачнай вартасці. Як правіла, гэта адбываецца пры пасрэдніцтве дзяржавы, напрыклад, у рамках рэалізацыі праграм сацыяльнага забеспячэння. Сёння мы з'яўляемся сведкамі сур'ёзнай палітычнай барацьбы вакол маштабаў гэтых выдаткаў» [2, с. 61].

У якасці галоўных арыенціраў палітыкі беларускай дзяржавы пры такім падыходзе можна назваць: канцэптуальнае вырашэнне праблем паглыблення сацыяльных трансфармацый ва ўмовах станаўлення постіндустрыяльнага грамадства, патрабаванняў інтэлектуалізацыі і гуманізацыі эканомікі, устойлівага культурна-інфармацыйнага і сацыяльна-экалагічнага развіцця. Сучаснае грамадства перажывае крызіс пераходу ад традыцыйнага да тэхнагеннага грамадства (па класіфікацыі В. С. Стэпіна). Велізарныя тэмпы і паскарэнне сацыяльных змен прыводзяць да таго, што прасторавая змена становіцца часавай, а «рэзервы росту чэрпаюцца ўжо не за кошт пашырэння культурных зон, а за кошт перабудовы саміх асноў ранейшых спосабаў жыццядзейнасці і фарміравання прынцыпова новых магчымасцяў» [3, с. 82]. Калі ў традыцыйным грамадстве галоўнай задачай чалавека была паспяховая адаптацыя да прыроднага асяроддзя, асоба разумелася як сузіральная, а дзяржава як вялікая сям'я, дзе кіраўнік – гэта бацька ўсяго народа, то ў тэхнагенным грамадстве чалавек – суб'ект крэатыўны, ён пераўтваральнік свету, асоба, якая валодае правамі, дзе інавацыя становіцца самакаштоўнасцю, а традыцыя ўвесь час пераасэнсоўваецца. Прызнаецца ідэя прагрэсу ў навуцы, культуры, чалавечым развіцці, а ідэя магчымасці кіравання рэчамі, прыроднымі працэсамі, сацыяльнымі аб'ектамі дамінуе. Гэтыя аб'екты складаюцца з людзей, і трэба разумець людзей, каб імі кіраваць, адсюль і ўвага да сацыяметрыі, тэорыі сацыяльнага пазнання і кіравання [3, с. 85].

Існуе і праблема палярызацыі грамадства ва ўмовах глабальных фінансавых, эканамічных, экалагічных, ваенна-палітычных нявызначанасцяў і рызык. Застаецца ў працэсе вырашэння задача захавання і паляпшэння сацыяльных умоў жыцця большасці насельніцтва (даступнасці адукацыі, аховы здароўя, сацыяльнага забеспячэння). Такая характарыстыка падкрэслівае толькі два моманты: па-першае, адноснасць, рэлятыўнасць усіх сацыяльных устаноў сучаснасці, а таксама транзітыўны характар сацыяльна-палітычных і эканамічных працэсаў у грамадстве. Па-другое, праблемны, адкрыты для дыскусій характар самога працэсу ўстойлівага прагрэсіўнага развіцця грамадства як дасягненні належнай якасці жыцця. І паколькі сацыяльная палітыка дзяржавы ёсць макрасацыяльная

дзейнасць, якая ахоплівае ўсю ці значную частку грамадства, што часцей за ўсё выходзіць за межы асобаснага кола жыцця і прыватнай цікавасці, то яе маштаб, яе прасторавая спецыфіка лёгка кідаюцца ў вочы.

Французскі сацыёлаг А. Турэн у сваёй кнізе «Вяртанне чалавека дзеючага. Нарыс сацыялогіі» [4, с. 71] даказвае, што палітычнае жыццё ўсё больш і больш атаясамліваецца з кіраваннем эканомікай, а грамадскае жыццё з вобласцю культуры і праблемамі асобы, якія не залежаць ад інстытутаў улады. Таму ўжо нельга лічыць, што палітычныя інстытуты з'яўляюцца адэкватным адлюстраваннем грамадскіх сіл і інтарэсаў. Паколькі грамадскае жыццё ўяўляецца сеткай грамадскіх адносін дзеючых асоб, якія кіруюцца, прынамсі, столькі ж уласнымі праектамі і стратэгіямі, колькі матывамі, прадыктаванымі іх ролямі і статусамі, і жыццё заснавана на даверы ў грамадстве, то яно і не можа аналізавацца як сістэма, якая кіруецца структурай і толькі ўнутранымі законамі арганізацыі. У сувязі з гэтым намаганне П. Бурдзье зняць супярэчнасць паміж структурай і агентам сацыяльнага дзеяння, якія ўвогуле знаходзяцца ў дыялектычным узаемадзеянні, з'яўляецца бінарнай апазіцыяй [1, с. 110–112], і ўяўляецца вельмі прадуктыўнай. Менавіта размеркаванне розных відаў капіталу (эканамічны, культурны, сацыяльны, экалагічны, сімвалічны) у сацыяльнай прасторы і структуруе яго. Праз вычляненне з сацыяльнай прасторы структурнага элемента сацыяльнага капіталу можна знаходзіць і ацэньваць розных сацыяльных суб'ектаў, іх статусныя пазіцыі.

Вылучаючы два напрамкі, якія апісваюць і тлумачаць сацыяльныя паводзіны (першы: паводзіны сацыялізаванага элемента кіруюцца сацыяльнымі нормамі, правіламі і абавязацельствамі, і другі: індывіды дзейнічаюць самастойна, кіруючыся ўласнымі інтарэсамі), Дж. Коўлман падкрэслівае, што сацыяльны капітал – гэта канцэптуальны інструмент для вырашэння тэарэтычных задач, і ў ім прысутнічае сінтэз гэтых двух падыходаў [5]. З аднаго боку, першы сацыялагічны падыход пазбаўляе дзейную асобу стымулу, унутранага імпульсу да дзеяння. Чалавек, ці сацыяльны агент, ёсць толькі прадукт навакольнага асяроддзя. У той жа час эканамічны напрамак пастаянна карэкціруецца рэальнасцю: дзеянні індывідаў фарміруюцца, накіроўваюцца і рэгулююцца нормамі і правіламі паводзін у грамадстве, асабістым даверам, узроўнем кансалідацыі, сацыяльнымі сувязямі, эканамічным, палітычным і культурным патэнцыялам грамадства. Дж. Коўлман прыводзіць прыклады ўплыву сацыяльнай арганізацыі і якасці сацыяльных сувязяў на эканамічную эфектыўнасць, у прыватнасці, адносіны паміж членамі каманды ўплываюць на паспяховае вядзенне спраў [5, 6].

Сацыяльны капітал вызначаецца сваімі функцыямі і ў той жа час не падпадае пад строгую дэфініцыю. Без яго немагчыма дасягнуць пастаўленых грамадска значных мэт, ён спрыяе гармадзізацыі вызначаных дзеянняў усярэдзіне структур, але адказвае толькі за шэраг сувязяў, не характарызуючы гэтыя функцыі. Яго спецыфіка ў пэўных сферах, спрашчаючы ўзаемадзеянне, можа паўплываць негатыўна ў іншых, для якіх яго патэнцыял не працуе. Некаторыя прыклады Дж. Коўлмана ілюструюць гэтую ўласцівасць. Вузкая замкнёная гільдыя сусветных гандляроў дыяментамі цесна злучана сямейнымі, нацыянальнымі і культутрнымі сувязямі і не мае патрэбы ў дадатковых мерах кантролю і бяспекі пры передачы ад аднай кампаніі да іншай буйных партый дыяментаў. Грувасткая сістэма кантролю і недаверу зрабіла б гэты бізнес немагчымым. Студэнты аднаго ўніверсітэцкага братэрства адчуваюць давер да былой супольнасці і забяспечваюць падтрымку сваім удзельнікам у далейшым жыцці, нават калі яны не звязаныя інтарэсамі справы. У іх агульная падрыхтоўка, адукацыя, культурны ўзровень, паспяховасць у справах, яны жылі ў адных умовах і наведвалі адны цэрквы.

Прынцыпы арганізацыі сацыяльнага капіталу забяспечваюць больш познія камунікацыі. Пераезд сям'і з вялікага горада ў вёску дазваляе бацькам, не хвалююючыся, адпускаць дзяцей без нагляду, бо іх дзеці гуляюць пад наглядам дарослых, якія знаходзяцца побач. А ў буйных гарадскіх агламерацыях такой структуры няма. Можна сказаць, што сем'і, якія жывуць у сельскай мясцовасці, маюць нейкі сацыяльны капітал. Паходжанне сацыяльнага капіталу звязана са зменамі ў адносінах сярод індывідаў, што палягчае іх дзейнасць і ўзаемадзеянне. Фізічны капітал увасоблены ў матэрыяльных формах, чалавечы капітал праяўляецца больш ускосна, у новых ведах, сацыяльны ж капітал адчуваецца яшчэ слабей, паколькі выяўляецца толькі ва ўзаемаадносінах, і паспяховасць дзеяння групы на яго аснове выяўляецца толькі ў лепшых выніках, суаднясенне якіх можа быць і з іншымі механізмамі эфектыўнасці.

Калі «А» робіць нешта для «Б» і мяркуе, што «Б» адкажа ў будучыні ўзаемнасцю, гэта нагадвае «даверныя распіскі», калі не будзе страчаны давер, піша Дж. Коўлман. Надзейнасць сацыяльнага асяроддзя азначае, што дамоўленасці не толькі выконваюцца, але і ўвесь час пашыраюцца. Апісваючы давер, Ф. Фукуяма падкрэслівае, што «…чаканне таго, што іншыя будуць паводзіць сябе больш-менш прадказальна, сумленна і з увагай да патрэб навакольных», з'яўляецца пэўным патэнцыялам грамадства [6, с. 52]. Так, мясцовыя органы самакіравання, касы ўзаемадапамогі на вытворчасці або па месцы жыхарства, кааператыўныя фонды не могуць існаваць без даверу сваіх удзельнікаў. Але гэта ж прадугледжвае і

адносную замкнёнасць структуры. Падобныя адносіны немагчымы па-за рамкамі супольнсці [7].

Сацыяльны капітал можна апісаць як «пэўны патэнцыял грамадства, заснаваны на даверы, які з'яўляецца грамадскім рэсурсам, што ўключае ў сябе сацыяльныя сеткі, нормы, інфармацыйныя каналы» [7, с. 38]. На мікраўзроўні гэта каштоўнасці сям'і і сяброўства, калегіяльнай падтрымкі і талерантнасці ў зносінах. Наступны ўзровень уключае ўцягнутасць у грамадскія арганізацыі, рухі і актыўныя групы, партыйныя структуры. Яшчэ вышэй наступны ўзровень закранае буйныя палітычныя інстытуты ўлады і грамадзянскай супольнасці, кантроль выбаршчыкаў над уладнымі структурамі, выбарнасць, дэмакратыю, рэакцыю грамадства на несправядлівасць. Самы высокі ўзровень – гэта міжнародныя арганізацыі: Арганізацыя Аб'яднаных Нацый, Еўрапейскі Саюз, Сусветная гандлёвая арганізацыя, Інтэрпол, узаемадзеянне міжнародных структур, міжнароднае права. На верхнім метаўзроўні сацыяльны капітал адыгрывае вырашальную ролю ў палітычным і эканамічным міжнародным супрацоўніцтве.

Аналіз стану сучаснага беларускага грамадства паказвае, што яно ў пэўнай меры кансалідавана [8]. Аднак сацыяльныя сеткі, як правіла, накіраваны на вузкагрупавыя інтарэсы і не маюць механізмаў рэтрансляцыі і пранікнення на іншыя сацыяльныя ўзроўні. Ва ўмовах нарастання сацыяльнай няроўнасці і расслаення грамадства сацыяльны капітал у беларускім грамадстве выступае як фактар дзяржаўнага кантролю над грамадскімі рэсурсамі, а сацыяльны давер знаходзіцца ў неналежным стане.

Сацыяльны капітал у беларускім грамадстве можа быць апісаны як рэдукаваная легітымнасць на аснове патэрналізму, якая праяўляецца ў незбалансаванасці фармальнага і нефармальнага ўзаемадзеяння. Можна пагадзіцца з меркаваннем расійскага вучонага Кротава Д. У., што «трансфармацыйныя працэсы прывялі да “аднавектарнасці” ў развіцці сацыяльнага капіталу, калі сістэма сацыяльных адносін знаходзіцца пад кантролем уладных і эканамічных суб'ектаў» [9, с. 44].

Можна казаць пра з'яўленне некаторых рыс парушэння ўстойлівасці, сацыяльнага капіталу, выкліканых адносінамі недаверу паміж дзяржаўнымі органамі ўлады і грамадствам. Ілюстрацыяй могуць служыць некаторыя грамадскія, моладзевыя рухі, ініцыяваныя не знізу, а зверху. Раз'яднанасць беларускіх грамадзян у спалучэнні з недаверам да сацыяльных інстытутаў абмяжоўваюць сацыяльны капітал мікраўзроўнем, накіроўваючы яго ў асноўным на задавальненне асабістых або лакальных інтарэсаў. Можна лічыць недастатковым развіццё ў краіне грамадскіх ініцыятыў, прафсаюзаў, студэнцкіх, праваабарончых і экалагічных арганізацый, а таксама неразвітасць дабрачыннасці. Так, паводле даследавання грамадскай думкі, прысвечанага вывучэнню каштоўнасцяў беларускага грамадства і праведзенага ў 2018 г. кампаніяй MIA Research [10], 60% беларусаў лічаць, што прыярытэтам павінна быць абарона навакольнага асяроддзя, нават калі гэта крыху затрымае эканамічны рост і прывядзе да скарачэння працоўных месцаў, і ў той жа час 41% апытаных мяркуе, што стан навакольнага асяроддзя ў краіне крытычны, але пры развіцці эканомікі гэта не ўлічваецца [10]. Тое ж самае адносіцца і да інфармацыйнага поля, закрытага і залішне цэнзураванага.

**Заключэнне.** Камунікатыўная рацыянальнасць, уласцівая сацыяльнаму капіталу, абумоўлівае дасягненне разумення і згоды адносна мэт на аснове дыялога паміж суб'ектамі сацыяльнага дзеяння. У адрозненне ад дзеяння на аснове супрацоўніцтва, стымулам якога з'яўляецца ўзнагароджанне або пагроза, экалагічная адказнасць залежыць ад ступені добраахвотнай уцягнутасці ў адпаведнае дзеянне людзей зацікаўленых, якія ўсведамляюць экалагічныя праблемы. Дыялог паміж імі садзейнічае ўсведамленню ўзаемных правоў і маральных абавязкаў, прадукуе салідарнасць, якая мае ўнутраную сувязь са справядлівасцю. Асаблівае месца ў структуры сацыяльнага капіталу, сацыяльнай салідарнасці і экалагічнай адказнасці належыць ведам, інфармацыі, інфармацыйным тэхналогіям. Акрамя таго, функцыю сацыяльнага капіталу веды і інфармацыя пачынаюць выконваць толькі ў адпаведным «тэхналагічным пакаванні», гэта значыць, толькі будучы ўкаранёнымі ў практыку, у прыватнасці ў вытворчасць. Як і любы капітал, сацыяльны патрабуе прырашчэння і выкарыстання: ён павінен «працаваць» на карысць уласніка (грамадства). Таму выкарыстанне сацыяльнага капіталу можна разглядаць шырэй, як аднаўленне не толькі сацыяльнай справядлівасці і фармальнай роўнасці эканамічных магчымасцяў, але і як рэалізацыю права на належную якасць навакольнага прыроднага асяроддзя і вяртання грамадству, а значыць, кожнаму яго ўдзельніку экалагічнай адказнасці.

У чалавека ёсць магчымасць усвядоміць прычыну экалагічных праблем як сваіх уласных і выбраць варыянты рашэння. Калі будзе пабудавана мадэль новага стаўлення да жыцця і прыроднага асяроддзя, грамадства павінна забяспечыць засваенне гэтай мадэлі чалавекам з дзяцінства так, каб у рэалізацыі яе кожны бачыў мэту і сэнс свайго існавання. Зыходзячы з такога падыходу, аптымальным рашэннем бачыцца не проста адмова ад дзеяння на карысць сабе, калі гэта прынясе шкоду іншаму, ці грамадству, ці прыродзе. Рашэннем можа быць сітуацыя, калі любое дзеянне выконваецца толькі тады, калі яно на карысць іншаму чалавеку, грамадству, прыродзе. У адваротным выпадку прырода дзеяння губляе «рэсурс даверлівасці» і застаецца эгаістычнай.

Экалагічная адказнасць не вычэрпваецца толькі ўзроўнем інфармаванасці грамадства па шэрагу экалагічных праблем. Яна цесна звязана з паняццем экалагічнай і духоўнай культуры, уключае і этычныя ацэнкі, экалагічныя характарыстыкі сацыяльнай камфортнасці, а таксама сацыяльна-экалагічнае прагназаванне, адэкватную экалагічную палітыку, наяўнасць дэмакратычных механізмаў прыняцця рашэнняў па экалагічных праблемах, сацыяльную адказнасць, грамадзянскую пазіцыю па актуальных пытаннях жыцця свайго грамадства і дзяржавы. Менавіта ў гэтым ключы і магчыма казаць пра тое, што сацыяльны капітал становіцца адным з прыярытэтаў устойлівага сацыяпрыроднага развіцця.

## Спіс літаратуры

1. Бурдье П. Социология политики. М.: Socio-Logos, 1993. 336 с.

2. Валлерстайн И. Конец знакомого мира: Социология XXI века. М.: Наука, 2004. 368 с.

3. Степин В. С. Цивилизация и культура. СПБ.: СПбГУП, 2011. 408 с.

4. Турен А. Возвращение человека действующего. Очерк социологии. М.: Научный мир, 1998. 204 с.

5. Коулман Дж. Капитал социальный и человеческий // Психология и бизнес. URL: https://science-education.ru/ru/article/view?id=636 (дата обращения: 03.02.2023).

6. Фукуяма Ф. Доверие: социальные добродетели и путь к процветанию М.: АСТ Москва, 2008. 730 с.

7. Бондарь Е. А. Доверие и социальный капитал в российских и западных социокультурных условиях // Научная мысль Кавказа. 2012. № 4. С. 37–41.

8. Министерство труда и социальной защиты Республики Беларусь. Разъяснение порядка назначения семейного капитала и распоряжения его средствами (05.03.2015). URL: http://www.mintrud.gov.by/ru/sem politikasem_kap (дата звароту: 01.12.2018).

9. Кротов Д. В. Социальный капитал российской молодежи. Ростов н/Д: Изд-во ЮФУ, 2009. 192 с.

10. Опрос. Изучение ценностей белорусского общества. URL: http://www.kef.by/publications/research/opros-izuchenie-tsennostey-belorusskogo-obshchestva/ (дата звароту: 30.11.2020).

## References

1. Bourdieu P. *Sotsiologiya politiki* [Sociology of politics]. Moscow, Socio-Logos Publ., 1993. 336 p. (In Russian).

2. Wallerstein I. *Konets znakomogo mira: Sotsiologiya XXI veka* [The end of the familiar world: Sociology of the XXI]. Moscow, Nauka Publ., 2004. 368 p. (In Russian).

3. Stepin V. S. *Tsivilizatsiya i kul'tura* [Civilization and culture]. St. Petersburg, SPbGUP Publ., 2011. 408 p. (In Russian).

4. Touraine A. *Vozvrashcheniye cheloveka deystvuyushchego. Ocherk sotsiologii* [The Return of the Acting Man. Essay on sociology]. Moscow, Nauchnyy mir Publ., 1998. 204 p. (In Russian).

5. Coleman J. Social and human capital. Available at: :https://psycho.ru/library/3930 (accessed 12.11.2023) (In Russian).

6. Fukuyama F. *Doveriye: sotsial'nyye dobrodeteli i put' k protsvetaniyu* [Trust: social virtues and the path to prosperity]. Moscow, AST Moscow Publ., 2008. 730 p. (In Russian).

7. Bondar E. A. Trust and social capital in Russian and Western sociocultural conditions. *Nauchnaya mysl' Kavkaza* [Scentific thought the Caucasus], 2012, no. 4, pp. 37–41 (In Russian).

8. Ministry of Labor and Social Protection of the Republic of Belarus. Explanation of the procedure for assigning family capital and disposing of its funds (05.03.2015). Available at: http://www.mintrud.gov.by/ru/sem_politika_sem_kap (accessed 01.12.2018) (In Russian).

9. Krotov D. V. *Sotsial'nyy kapital rossiyskoy molodezhi* [Social capital of Russian youth]. Rostov-on-Don, Izd-vo YuFU Publ., 2009. 192 p.

10. Survey. Studying the values of Belarusian society. Available at: http://www.kef.by/publications/research/opros-izuchenie-tsennostey-belorusskogo-obshchestva/ (accessed 30.11.2020) (In Russian).

## Информация об авторе

**Захарава Наталля Яўгенаўна** – кандыдат філасофскіх навук, загадчык Аддзела сацыяльнай экалогіі і біяэтыкі. Инстытут філасофіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (220072, г. Мінск, вул. Сурганава 1/2, Рэспубліка Беларусь). E-mail: nz-a@tut.by

## Information about the author

**Zakharova Natallia Evgen'evna** – PhD (Philosophy), Leader of the Department of Social Ecology and Bioethics. Institute of Philosophy of the National Academy of Sciences of Belarus (1/2, Surganova str., 220072, Minsk, Republik of Belarus). E-mail: nz-a@tut.by

*Пастyпіў 11.03.2024*